# ШКОЛЬНАЯ ПЛАНЕТА

НЕ БУДЗЬ ЧУЖЫНЦАМ НА СВАЁЙ ПЛАНЕЦЕ!





*ДУА «Сярэдняя школа № 2 г. Беразіно»* *№ 6 (кастрычнік)*


# З ПРАФЕСІЙНЫМ СВЯТАМ!



*Паважаныя калегі!*
*Напярэдадні прафесійнага свята хачу выказаць вам словы падзякі за нялёгкую працу і вернасць прызванню. Няхай у вашых душах не згасаюць агонь педагагічнага таленту і імкненне да спасціжэння новага і нязведанага. Няхай лепшай узнагародай для вас будуць удзячныя вочы вучняў, якія прагнуць ведаў, шчырая ўдзячнасць бацькоў, годная аплата вашай нястомнай, велізарнай, высакароднай і вельмі патрэбнай нашаму грамадству педагагічнай працы.*
*Здароўя, высокіх дасягненняў, шчасця і пазітыўнага настрою, дарагія мае калегі!*
*Са святам!*

# З ЛЮБОЎЮ ДА ДЗЯЦЕЙ



**У пачатку новага навучальнага года калектыў педагогаў любой школы чакае папаўненне. Не стала выключэннем і СШ № 2 горада Беразіно, на калідорах якой мы адразу заўважылі новых людзей.**

Сярод іх - малады спецыяліст, былая выпускніца нашай установы адукацыі. Надзея Віктараўна Філічонак трапіла да нас па размеркаванні на пасаду педагога-арганізатара. Акрамя вызначаных праграмай святочных мерапрыемстваў, дзяўчына марыць наладзіць і правесці сярод вучняў што-небудзь незвычайнае.

– На некаторыя рэчы людзі ў сваім жыцці не звяртаюць увагі, лічачы іх дробязямі, - гаворыць Н.В. Філічонак. – Узяць для прыкладу «Дзень дабрыні», які не пазначаны ў календары. Правядзём яго – і ёсць надзея, што большасць людзей задумаецца над сваімі паводзінамі і зменіць іх у лепшы бок, у бок дабрыні і спагады да іншых.

Па спецыяльнасці Надзея Віктараўна - настаўнік беларускай мовы і літаратуры. Сёлета дзяўчына скончыла Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка. Па словах Н.В. Філічонак, у кожнай працы трэба шукаць плюсы. І першы з іх, што дзяўчына знайшла на сённяшні дзень, - магчымасць супрацоўніцтва з дзецьмі, якіх яна вельмі любіць.

- Ці ўзнікалі ў Вас сумненні з выбарам прафесіі пры паступленні? – пытаюся я.

- Тое, што пайшла настаўніцкай сцяжынкай - гэта не выпадковасць, - адказала Надзея Віктараўна. - Добрым прыкладам для пераймання стаў дзядуля, які шмат гадоў прысвяціў працы настаўнікам пачатковых класаў і скончыў у свой час той жа педагагічны ўніверсітэт. Ды і парады маёй любімай настаўніцы фізікі Ганны Сяргееўны Ізмер наконт ВНУ сталі моцным штуршком, каб без ваганняў вызначыцца з будучай спецыяльнасцю. Бацькі поўнасцю падтрымалі мой выбар.

Праца педагога-арганізатара патрабуе поўнай занятасці, шмат сілі намаганняў. Вольнага часу ў Н.В. Філічонак амаль не застаецца, але дзяўчына імкнецца знаходзіць доўгачаканыя гадзіны, каб атрымаць асалоду ад малявання. Для стварэння будучых кампазіцый Надзея Віктараўна выкарыстоўвае фарбы і алоўкі, а вобразы нараджаюцца з усяго таго, што вакол нас, з тых дробязей, якія часам складана заўважыць. Напярэдадні прафесійнага свята, Дня настаўніка, Надзея Віктараўна жадае сваім калегам цярпення, нязгаснага жадання працаваць, любві і павагі да вучняў, умення выслухаць і зразумець кожнага з іх.

**Таццяна БУЛОЙЧЫК.**

# СЁЛЕТНЯЕ ПАПАЎНЕННЕ



**Таццяна Анатольеўна МІРАНОВІЧ,**
выхавальнік групы падоўжанага дня.



**Алеся Мікалаеўна САВІК,**
настаўніца пачатковых класаў



**Людміла Мікалаеўна КАРАВАЯ,**
выхавальнік групы падоўжанага дня.



**Вольга Вячаславаўна ДАНІЛАВА,**
настаўніца замежнай мовы.

# ПЕРШЫ РАЗ У ПЕРШЫ КЛАС!



***У новым навучальным годзе на змену выпускнікам нашай установы прыйшоў толькі адзін першы клас.***

***- Дзеці падабраліся добрыя, - гаворыць настаўніца пачатковых класаў Ірына Пятроўна ДОЛБІНА. – Большасць ведае літары, некаторыя ўмеюць крыху чытаць па складах і лічыць у межах дзесяці, з захапленнем малююць у вольны ад заняткаў час. Кемлівасцю, лагічным мысленнем, актыўнасцю вызначаюцца Ганна КАМАРОЎСКАЯ, Рэната КАРПОВІЧ, Дар’я ЯСІКАВА. Хачу пажадаць сваім вучням здароўя, удачы, нязгаснага жадання вучыцца і пазнаваць навакольны свет.***

**Чым цікавяцца самыя маленькія вучні, што падабаецца ім больш за ўсё?**

**Віталь КАРПОВІЧ:**
- Больш за ўсё мне падабаецца вучыцца.

**Уладзіслаў АБЛУПІН:**
- Мне падабаецца пісаць.

**Ганна КАМАРОЎСКАЯ:**
- Люблю вучыцца.

**Ірына ШАЎЧЭНКА:**
- Падабаюцца мне нашы кветкі. Такая прыгажосць!

**Арцём СТАРАСЦЕНКА:**
- Мне падабаецца чытаць.

**Арцём БАНДЗІК:**
- Люблю гуляць з дзецьмі.

**Аляксандр КАЗЮКА:**
- Есці ў сталовай, маляваць.

**Павел БАНДЗІК:**
- Мне падабаюцца заняткі.

**Гутарыла Яўгенія ГАЛУЗА.**

# ТЫДЗЕНЬ СПОРТУ І ЗДАРОЎЯ

У перыяд з другога па чатырнаццатага верасня наша школа далучылася да рэспубліканскай акцыі “Тыдзень спорту і здароўя”, у рамках якой былі наладжаны спаборніцтвы па валейболе паміж камандамі настаўнікаў і вучняў старэйшых класаў, фізкультурнае свята “Тата, мама, я – спартыўная сям’я”, спартландыя “Вышэй, далей, хутчэй” і інш.











ПРОБА ПЯРА

# ПЕДАГОГУ ПРЫСВЯЧАЕЦЦА...



**Са святам вас, шаноўныя педагогі, настаўнікі і выхавальнікі!**

*Моцнага вам здароўя, больш нагод для радасці не толькі ў святы, але і ў будні, удзячнасці ад вучняў і выхаванцаў, шанавання ад іх бацькоў, разумення і падтрымкі ад калег і толькі сонечных дзён у жыцці.*

Вельмі складана мне выбраць аднаго настаўніка, які б падабаўся больш за іншых. Аксана Мікалаеўна КАЗАЧОНАК выкладае ў нашым класе такі важны прадмет, як гісторыя. Настаўніца цудоўна ведае свой прадмет, даступна і зразумела тлумачыць матэрыял. На ўрокі гісторыі ходзіш з нейкім іншым настроем. Я разумею, як цяжка да кожнага вучня данесці матэрыял, але Аксана Мікалаеўна робіць гэта з майстэрствам.

Мы павінны паважаць нашых настаўнікаў, якія не шкадуючы сіл і часу, настойліва і цярпліва вучаць нас. Мы не маем права забывацца на тых, хто адкрывае нам дарогу ў дарослае жыццё.

Ірына ЗАЗЕРСКАЯ.

***

Прафесія настаўніка вельмі складаная. Яна забірае шмат часу і сіл. Настаўніку трэба кожны дзень правяраць нашы веды і тлумачыць новы матэрыял. Надзея Мікалаеўна УЛАСЮК, настаўніца англійскай мовы, - маладая жанчына з цёмнымі валасамі і прыгожымі вачыма. Яна добрая і ўважлівая. Мне падабаюцца ўрокі Надзеі Мікалаеўны. Нават самае складанае настаўніца тлумачыць цікава і зразумела.

Ксенія ГУРЭНЧЫК.

***

Лідзія Вячаславаўна КАРЧЭЎСКАЯ – мая першая настаўніца. Прафесія педагога – адна з самых галоўных. Колькі працы і цярпення трэба, каб першакласнікі сталі сапраўднымі людзьмі, разумнымі і выхаванымі. Я добра памятаю, як мы стараліся выводзіць літары і лічбы. У Лідзіі Вячаславаўны ветлівая ўсмешка і добрыя вочы. Настаўніца заўсёды нам ва ўсім дапамагала. Калі я пакідала чацвёрты клас, шкада было развітвацца з любімай настаўніцай.

Лідзія Вячаславаўна, Вы навучылі нас самаму галоўнаму! Шчыры дзякуй Вам за гэта!

Ірына ЕРАМІН.



# 14 КАСТРЫЧНІКА - ДЗЕНЬ МАТУЛІ

Для кожнага чалавека маці – самы дарагі і блізкі чалавек. Хто лепш за ўсіх цябе зразумее, пашкадуе, дапаможа ў цяжкія хвіліны? Канечне, дарагая матуля! Кожная маці хоча бачыць сваіх дзяцей здаровымі і шчаслівымі. Ад самай калыскі мы адчуваем клопат родных матуль, якія разам з намі радуюцца і перажываюць.

*Я слаўлю мамы светлае імя –*
*Пяшчотнае, нібыта яблынь квецень.*
*Матулінага сэрца цеплыня*
*Нас сагравае лепш за ўсё на свеце.*

*Я слаўлю мамы светлую душу,*
*Якая разумее нас з паўслова.*
*Я толькі маму памагчы прашу,*
*Калі жыццё паставіцца сурова.*

*Я слаўлю позірк маміных вачэй,*
*Якія бачаць, што нам невядома.*
*Даруйце боль праплаканых начэй,*
*Калі нас доўга не бывае дома.*

*Я слаўлю маму, бо яна – як Бог –*
*Усім прабачыць і усё дарує,*
*Яна для нас сабою ахвярue,*
*Як аніхто пакуль яшчэ не змог.*

Мікола ЛЯШЧУН.

# З НАГОДЫ!





**Віншуем з 60-гадовым юбілеем настаўніка гісторыі Георгія Міхайлавіча КАРЧЭЎСКАГА!**

*За плячыма педагога - вучоба ў Брадзецкай сярэдняй школе і Мінскім дзяржаўным педагагічным інстытуце імя М. Горкага. Першым працоўным месцам для маладога настаўніка гісторыі стала Сялібская сярэдняя школа, якую ён узначаліў у 1980 годзе. Затым была праца выхавальнікам у Бярэзінскай школе-інтэрнаце, а з 1987 года Г.М. Карчэўскі ўжо ў штаце супрацоўнікаў СШ №2 горада Беразіно. У 2002 годзе настаўніку прысвоена вышэйшая кваліфікацыйная катэгорыя. За шматгадовую і адданую працу Георгій Міхайлавіч карыстаецца заслужаным аўтарытэтам сярод калег і павагай сярод розных пакаленняў вучняў.*

# ВЕРАСНЁЎСКІ АБ'ЕКТЫЎ











ГУО «Средняя школа № 2 г. Березино»

ШКОЛЬНАЯ ПЛАНЕТА

ДУА «Сярэдняя школа № 2 г. Беразіно» 223311, горад Беразіно, вуліца Мультана, 19.
Эл. пошта: berezinosch2.edu@tut.by
Сайт: berezino2.schools.by
Клуб «Юны журналіст»

**КЛУБ "ЮНЫ ЖУРНАЛІСТ" ЗАПРАШАЕМ ДА СУПРАЦОЎНІЦТВА ТВОРЧЫХ, ІНІЦЫЯТЫЎНЫХ І АКТЫЎНЫХ АСОБ! ДАЛУЧАЙЦЕСЯ, КАЛІ ЛАСКА! МЫ БУДЗЕМ РАДЫ БАЧЫЦЬ У СВАІХ РАДАХ КОЖНАГА З ВАС!**